# ГЕРМАНИЯ В СИСТЕМЕ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЙ

## БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІЯ АДНОСІНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII-XVI СТАГОДДЗЯХ

Коршак М.А.
*г. Брэст, БДУ імя А.С. Пушкіна*

Вядома, што ў сярэдзіне XIII ст. пачало фарміравацца Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (ВКЛ). Гэта было ў той час, калі без малога тры стагоддзя існавала Святая Рымская імперыя германскай нацыі. Пачынаючы з першых князёў ВКЛ да Вітаўта ўключна гэта княства ўсё больш і больш умацоўвала свае пазіцыі. Адначасова ў Германіі ўсё больш і больш прасочвалася тэндэнцыя да дэцэнтралізацыі.

У аналізуемы перыяд значнае месца ў беларуска-нямецкіх сувязях займаў гандлёвы напрамак. Частка Беларусі выконвала для нямецкіх купцоў функцыю транзіта. "Солдая (Судак) і адбудаваная генуэзцамі ў 1296 г. пад назвай Кафы Феадосія былі галоўнымі размеркавальнымі партамі, адкуль усходія тавары накіроўваліся .... праз паўднёва–рускія стэпы ў Польшчу, Чэхію і Германію. Гэтымі таварамі былі карэнне, шоўк. Найбольшы росквіт гэтага гандлю адносіцца да 14 і пачатку 15 ст." [1,201]. Зразумела, роля беларускага фактара залежала ад таго, дзе знаходзіўся цэнтральны размеркавальны пункт. Спачатку гэта быў "Уладзімір на Валыні", які прыцягваў да сябе купцоў з Польшчы і Прусіі і, такім чынам , звязваў поўдзень з Балтыйскім узбярэжжам і Фландрыяй. З сярэдзіны 14 ст. у якасці канкурэнта Уладзіміра вырастае Львоў, а пазней з ім канкурыруе Кракаў. Гэты напрамак гандлю больш цесна звязаў Беларусь з заходнееўрапейскім гандлем. Гэты кірунак даваў выхад беларускім таварам. Важнейшым пунктам гэтага гандлю у 15 і 16 ст. з'яўляецца Берасце. Вырастае значэнне Любліна з яго знакамітымі кірмашамі. Атрымліваюць гандлёвае значэнне некаторыя іншыя. Ва Уладзіміры, а пазней у Львове заходнія купцы куплялі воск, футра, шоўк і карэнне. Такім чынам, тут сыходзіліся тавары Беларусі (воск, футра), маскоўскія ... і ўсходнія ... Сюды ж траплялі тавары з Прусіі і Фландрыі.

Падзенне Кафы ў 1475 г., захоп туркамі Белграда ў 1482 г. і, нарэшце, падзенне Канстанцінопаля былі момантамі, калі гэты гандаль атрымаў моцны ўдар і страціў свой усходні характар. Але для Беларусі гэты напрамак і ў далейшым усё ж захаваў сваё значэнне. Берасцьце было тымі варотамі, цераз якія Беларусь звязвалася з Польшчай і паўднёвай Германіяй" [1,202-203].

"Значную частку насельніцтва (горада над Бугам. – М.К.) у 15 ст. складалі замежныя гандлёвыя людзі, называлі іх нямецкія купцы. У Берасці была нямецкая вуліца (1485)" [2,52].

Як бачым, "купцы беларускіх гарадоў гандлявалі з ... германскімі гарадамі ... Вялікім попытам ... у Вялікім Княстве Літоўскім ... карысталіся ... нямецкія сукны" [3,99].Яшчэ ў пачатку XIII ст. купцы, якія належалі да саюза Ганза, сталі наведваць гарады беларускага Падзвіння. Беларускія гарады, з аднаго боку, і Ганза, з другога боку, толькі выйгралі ад заключэння добра вядомай дамовы 1229 года. Стаў рэальнасцю вольны гандаль смалян, палачан, віцеблян у Рызе, на Гоцкім беразе, іншых месцах. У сваю чаргу ганзіейцы атрымалі магчымасць беспераішкодна займацца сваей справай у Падзвінні.

З сярэдзіны XIII ст. узяла адлік свайго існавання пастаянная ганзейская факторыя ў Полацку, што падкрэсліла ключавую ролю радзімы Скарыны ў гандлёвых сувязях гэтага рэгіёна з Ганзай. Нямецкія купцы разгарнулі актыўную дзейнасць у розных кутках Усходняй Еўропы. Але найбольш спрыяльна да іх ставіліся менавіта ў Полацку. Заўважым, што Ганза праіснавала з XIII па XVII ст.

З самага пачатку існавання ВКЛ адной са складанейшых задач для яго было вызначэнне адпаведнай лініі ў дачыненні да Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў. Гэта было галаўным болем для яго вялікіх князёў значную частку XIII і XV стагоддзяў, усё XIV

стагоддзе. Вельмі частай з'явай былі крыжацкія набегі, якія прычынялі Княству вялікія матэрыяльныя і людскія страты, ставілі пад пагрозу захаванне яго незалежнага статусу.

Ключавое значэнне ў барацьбе з крыжакамі мела выдатная перамога беларусаў, літоўцаў і палякаў над Тэўтонскім ордэнам пад Грунвальдам у 1410 годзе. Толькі ў другой чвэрці XV стагоддзя пагроза з боку гэтага ордэну была канчаткова знята.

Адным з важнейшых аспектаў у адносінах паміж ВКЛ, Каронай Польскай і Тэўтонскім ордэнам таксама быў гандаль. Яшчэ да Грунвальдскай бітвы былі заключаны адпаведныя дагаворы (1402 г.. 1404 г.). "Пасля 1410 г. Ордэн пайшоў насустрач патрабаванням вялікага князя літоўскага і караля польскага ў справе пашырэння правоў літоўскіх і польскіх купцоў. Паводле наступных дагавораў, купцы з Польшчы, Літвы, Жмудзі, Мазовіі і Русі маюць права вольнага гандлю і праезду па тэрыторыі Ордэна сухім ці марскім шляхам з аплатай толькі старой пошліны. Ім даецца права прыпынкаў і продажу тавараў на прыпынках. Са свайго боку і ордэнскія купцы маюць права вольнага продажу сукнаў у розніцу і права вольнага вывазу збожжа і жывёлы. Гэтыя дагаворы адкрывалі для Літвы вольны шлях да Гданьска, які становіцца для Літвы цэнтрам вольнага гандлю" [1,204].

У аналізуемы перыяд у еўрапейскіх справах шмат што залежала ад пазіцыі Святой Рымскай імперыі германскай нацыі. Ёсць сведчанні аб тым, што яе імператар успрымаў Вялікага князя Літоўскага Вітаўта як сур'ёзную постаць. У якасці прыклада можна назваць удзел першай асобы імперыі ў з'ездзе, які адбываўся ў Луцку ў 1429 годзе.

Заўважым, што ВКЛ неаднойчы заключала саюзы з Святой Рымскай імперыяй, якія адпавядалі яго інтарэсам. У гэтай сувязі важнае месца займаў Венскі кангрэс 1515 г. У кангрэсе удзельнічалі імператар Святой Рымскай імперыі Максімільян I Габсбург. Кароль Венгрыі і Чэхіі Уладзіслаў I Ягелон, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт I. Апошні і жадаў "прадухіліць пагрозу ваеннага нападу на Польшчу з боку імператара ў час вайны паміж Маскоўскай Руссю і Вялікім княствам Літоўскім 1512-1522 гг., а таксама ліквідаваць патранаж імператара над Тэўтонскім ордэнам"[4,274]. Вынік кангрэса быў на карысць ВКЛ: "Максімільян I адмовіўся ад патраната над Тэўтонскім ордэнам, даў згоду на сваё пасрэдніцтва ў перамовах з вялікім князем маскоўскім Васілём III аб спыненні вайны паміж Маскоўскай Руссю і Вялікім княствам Літоўскім" [4,274].

"Сапраўды, праз некаторы час у Маскву было накіравана імперскае пасольства на чале з баронам Сігізмундам Герберштэйнам. Жыгімонт I і Уладзіслаў Ягайлавіч абяцалі ўступіць у антытурэцкую кааліцыю, якую павінен быў узначаліць папа Лявон X. Прынятыя пагадненні здымалі напружаннасць паміж дзяржавамі і прадугледжвалі сяброўскія дачыненні Святой Рымскай імперыі да Польшчы і Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Яны спрыялі далейшаму развіццю сувязяў паміж краінамі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы" [5,93].

Лівонская вайна 1558-1583 гг. кардынальна паўплывала на адносіны паміж ВКЛ і Інфлянтамі. Менавіта гэтая вайна была адным з галоўных фактараў, якія "схілілі вялікага магістра Інфлянцкага ордэна Г.Кетлера да падданства вялікаму князю ВКЛ". Дамова да-падпарадкавання ( Pacta subiectionis) падпісана 5.03.1562 г. Ордэн быў секулярызаваны, а Г.Кетлер стаў ленным герцагам (князем) у паўднёвай частцы Інфлянтаў: Курляндскім і Земгальскім герцагстве. Ён быў часова прызначаны губернатарам правабярэжных Інфлянтаў – Задзвінскага герцагства (княства). У склад ВКЛ Інфлянты ўключаны 26.12.1566 г. на Гарадзенскім сойме пад назвай Інфлянцкае княства з наданнем яму герба" [6,499].

"У XV-XVI стагоддзях - у эпоху Рэнесанса і Рэфармацыі – у Германію пачала пранікаць беларуская культура. Гэта быў час дзейнасці выдатнага беларускага асветніка Францыска Скарыны, пачатку кнігадрукавання на Беларусі, шырокага распаўсюджвання перакладной літаратуры"[7,153]. Менавіта ў гэты час у Гейдэльбергскім, Інгальштацкім, Лейпцыгскім, Кёнігсбергскім, Цюбінгенскім, Віценбергскім універсітэтах можна было сустрэць сярод студэнтаў нашых землякоў.

Да беларуска-нямецкіх сувязяў мае дачыненне і лютэранства. Яго радзіма – Германія. Менавіта немец Лютэр стаяў ля вытокаў дадзенай рэфармацыйнай плыні. "На землі Беларусі лютэранства пачало пранікаць у 1520-я гады з Лівоніі і з Усходняй Прусіі. Траплялa і непасрэдна з Германіі праз студэнтаў з ВКЛ, якія навучаліся ў ня-

мецкіх універсітэтах, асабліва у Лейпцыгскім ... У 1544 г. ва Усходняй Прусіі быў адкрыты пратэнстанцкі Кёнігсбергскі універсітэт, які значна паспрыяў распаўсюджванню лютэранства ў ВКЛ і Польшчы. Тут было заснавана некалькі кафедраў з навучаннем на польскай, літоўскай і беларускай мовах, устаноўлена некалькі стыпендыяў для выхадцаў з Беларусі, Літвы і Польшчы, друкавалася пратэстанцкая літаратура. З сярэдзіны 1550- х г. лютэранскія супольні з'явіліся ў Вільні, Мінску, Слуцку і інш." [8,420].

Ведучы размову аб пранікненні лютэранства на Беларусь, нельга не сказаць пра Аўраама Кульву (1510-1545). Лёс кідаў яго ў розныя краіны. А.Кульва, у прыватнасці, "вучыўся – у Германіі (Віценберг, Лейпцыг), дзе слухаў лекцыі М.Лютэра. Пасля вяртання на радзіму пры падтрымцы каралевы Боны і ваяводы віленскага Альбрэхта Гаштольда заснаваў у Вільні школу (1540), дзе вучыліся каля 60 чалавек. У школе часта выказваліся рэфармацыйныя ідэі. Свае погляды на стан царквы выказаў і ў пропаведзях у Віленскім касцёле святой Ганны"[9,297]. У сувязі з такімі паводзінамі А.Кульвы ўзнікла рэальная пагроза для яго жыцця. Ён "вымушаны быў пакінуць Вільню і схавацца ў Каралеўцы (Кёнігсбергу), дзе выкладаў у мясцовым універсітэце. У пачатку 1545 г. атрымаў дазвол вярнуцца ў Вільню, дзе неўзабаве памёр" [9,297].

Вядомым прадстаўніком рэфармацыйнага руху пасля знаходжання на нямецкай зямлі стаў і Андрэй Волан. "Пры падтрымцы Радзівілаў вучыўся ва універсітэтах Франкфурта-на Одэры і Кёнігсберга ... Аўтар палеміка-тэалагічных твораў, палітыка-праваых і этычных трактатаў, прамоў. Антыкаталіцкія працы Волана перавыдавалі пратэстанты Германіі"[10,350].

Лютэранства аказала нейкі ўплыў і на сістэму адукацыі ВКЛ. "У лютэранскіх школах выкладаліся катэхізіс, граматыка, арыфметыка, польская і "руская"(беларуская) мовы" [11,205]. Канешне ж, лютэранства закранула зусім абмежаваную колькасць жыхароў ВКЛ.

Беларуска-нямецкія сувязі ў часы існавання ВКЛ прынеслі нямалы плён у плане развіцця і ўдасканалення айчыннага заканадаўства. Высокая якасць шэрагу важнейшых прававых актаў у ВКЛ у значнай ступені прадвызначалася тым, што іх распрацоўшчыкі бралі ў разлік нямецкі прававы вопыт. "Саксонскае зярцала, зборнік германскага сярэдневяковага звычаёвага права ... мела ўплыў, ... асабліва праз нормы магдэбургскага права, ... на развіццё феадальнага права Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку на распрацоўку статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг." [12,524].

Шмат даў улік нямецкага вопыту гарадскога самакіравання на грунце магдэбургскага права. Дадзім слова буйнейшаму спецыялісту па гісторыі беларускіх гарадоў З.Ю.Капыскаму. Ён пісаў: "Магдэбургскае права – сукупнасць юрыдычных норм, што вызначалі саслоўна-прававое становішча ва ўмовах феадальнага грамадства. Склалася ў канцы XII-XIII ст. у г.Магдэбургу (Усходняя Германія). У XII-XVIII ст.ст. пашырана на тэрыторыю Польшчы, Літвы, Украіны, Беларусі" [13,499-500].

Новым важным момантам стала з'яўленне немцаў у этнічнай структуры краіны. "Пры непасрэдным садзейнічанні вялікага князя Гедыміна (1346-1341) на землях Вялікага княства Літоўскага сяліліся немцы, пераважна тыя, што валодалі рамесніцкімі прафесіямі... Немцы, ... трапіўшы ў наш край пад немінучыя працэсы асіміляцыі, не маглі, аднак не зрабіць адбітку і на беларускай культуры"[14,36]. У часы Гедыміна размова ішла аб рамесніках Любека, Брэмена."Да XVI стагоддзя адносіцца перасяленне немцаў у Полацк і Віцебск"[15,40].

Такім чынам, ёсць дастатковыя падставы лічыць, што беларуска-нямецкія сувязі ў акрэсленыя стагоддзі развіваліся складана, супярэчліва і нават трагічна. Разам з тым, мелі месца перыяды саюзных адносін, актыўнага гандлю, культурных узаемадачыненняў.


1. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1994.
2. Памяць:Гіст.-дакум.хроніка Брэста. У 2 кн. Кн.1. – Мн.: БЕЛТА, 1997.
3. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік. /Выд.2-е, дап. і перапр. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1995.

4. Грицкевич А.П. Венский контресс 1515 // Франциск Скорина и его время: Энцикл.справочник. – Мн.: БелСЭ, 1990.
5. Грыцкевіч А.П. Гісторыя геапалітыкі Беларусі // Спадчына 1994. №1.
6. Вяроўкін-Шэлюта У.Інфлянты // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.3. Мн.: БелЭн., 1996.
7. Соколовский В. Утверждение исконного. Белорусская культура в немецкоязычном мире // Нёман 1995, №4.
8. Казуля С., Шалькевіч В. Лютэранства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.4. Мн.: БелЭН, 1997.
9. Казуля С. Кульва Аўраам //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.4. Мн.: БелЭН, 1997.
10. Сокал С.Ф.Волан Андрэй // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.2. Мн.: БелЭН, 1994.
11. Дарашкевіч Э.К., Пасэ У.С., Сянькевіч Г.Р., Ткачоў М.А., Трухан А.Б. Асвета // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.1. Мн.: БелЭН, 1993.
12. Грыцкевіч А.П. Саксонскае зярцала // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн.: БелСэ, 1989.
13. Капыскі З.Ю. Магдэбургскае права // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн.: БелСэ, 1989.
14. Льгч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.
15. Майснер А. Гісторыя асаднiцтва і сучасныя праблемы немцаў Беларусі // Нацыянальныя меншасці Беларусі. Кніга 3. Актуальныя праблемы нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі. Брэст-Мінск, 1996.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІІ: ДА ПЫТАННЯ АБ СТАНЕ БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ

Коршак М.А.
*г. Брэст, БДУ імя А.С. Пушкіна*

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь увайшла ў склад Расіі. Перш за ўсё звернем увагу на геапалітычны аспект. "Тэрыторыя Беларусі ад канца XVIII ст. становіцца стратэгічным плацдармам для войнаў у Еўропе, месцам сталага размяшчэння вялікіх кантынгентаў расійскай арміі і адначасова перадполлем на выпадак наступальнай вайны з боку праціўніка, каб затрымаць тут варожую для Расіі армію і пазбегнуць матэрыяльных і людскіх стратаў на тэрыторыі Расіі" [1,48].

Упершыню гэтая тэза знайшла пацвярджэнне ў час паходу Напалеона на Расію ў 1812 годзе. Вядома, што ў складзе падначаленага яму ваеннага кантынгента былі і немцы: 7-ы саксонскі корпус удзельнічаў у Кобрынскім баі, Гарадзечанскай бітве, ваяваў на айчыннай тэрыторыі і ў час адступлення напалеонаўскіх войскаў. Першапачатковая колькасць гэтага корпуса без малага раўнялася 17 тысячам чалавек.

Заўважым, што Напалеон распачаў паход на Расію, маючы ў якасці саюзнікаў усе шматлікія германскія дзяржавы.

Як бачым, зноў нага ўзброенага немца ступіла на беларускую зямлю. Праўда, пасля гэтага яе не будзе на нашай тэрыторыі аж да 1914 г. Дачыненні нямецкіх дзяржаў пасля аб'яднання краіны (1871 г., Германскай імперыі) да беларусаў нярэдка былі не на карысць апошніх. Перш за ўсё гэта тычылася пытання аб нацыянальна-дзяржаўным самавызначэнні Беларусі. У час паўстанняў 1830/31 гг. і 1863/64 гг. у Польшчы і на Беларусі рэакцыя Прусіі была такой: "Беларусь і Літва лічыліся "рускімі губерніямі" і ў дыпламатычны разлік увогуле не браліся ..." [1, 51].

"У XIX стагоддзі з адраджэннем духоўнага жыцця на Беларусі паступова адбываецца новае знаёмства з яе культурай ... у Германіі. Гэтаму садзейнічалі пэўныя працэсы як у